УДК 821.161.3+82.09

# КАШТОЎНАСНАЯ ПАРАДЫГМА ЛІТАРАТУРНАЙ КРЫТЫКІ ЧАСОПІСА «ПОЛЫМЯ» 1920-х гг.

***А. А. КАРП***[1*]

[1*]*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, вул. Сурганава, 1, корп. 2, 220072, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Даследуецца каштоўнасная парадыгма літаратурнай крытыкі часопіса «Полымя» ў пачатковы перыяд яго існавання – 1922–1928 гг. Сцвярджаецца, што аксіялагічны падыход у многім прадвызначае іншыя аспекты, з гледзішча якіх можна аналізаваць літаратурную крытыку. Разглядаецца, якімі ўстаноўкамі кіраваліся крытыкі, як выбудоўвалі аксіялагічную сістэму ў сваіх публікацыях. Даказваецца, што ў 1920-х гг. суіснавалі розныя літаратурныя канцэпцыі, раскрываецца іх змест, вызначаючца прыярытэты тагачаснай крытыкі. Звернута ўвага на канфлікт паміж сацыялагічнай і эстэтычнай крытыкай, абгрунтоўваецца значнасць апошняй для літаратурнага працэсу. Зроблена выснова пра тое, што плюралізм, які дапускаўся рэдакцыяй часопіса «Полымя», меў істотнае значэнне як для выдання, так і наогул для літаратурнай думкі гэтага перыяду.

***Ключавыя словы:*** 1920-я гг.; літаратурны працэс; літаратурная крытыка; літаратурная перыёдыка; «Полымя»; каштоўнасная парадыгма; эстэтычны дыскурс; ідэалагічны дыскурс; нашаніўская традыцыя; У. Чаржынскі; М. Байкоў; І. Замоцін.

# ЦЕННОСТНАЯ ПАРАДИГМА ЛИТЕРАТУРНОЙ КРИТИКИ ЖУРНАЛА «ПОЛЫМЯ» 1920-х гг.

***Е. А. КАРП***[1)]

[1)]*Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы Национальной академии наук Беларуси, ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, г. Минск, Республика Беларусь*

Исследуется ценностная парадигма литературной критики журнала «Полымя» в ранний период его существования – 1922–1928 гг. Отмечается, что аксиологический подход во многом определяет другие аспекты, с точки зрения которых можно анализировать литературную критику. Рассматривается, какими установками руководствовались критики, как выстраивали аксиологическую систему в своих публикациях. Доказывается, что в 1920-х гг. сосуществовали разные литературные концепции, раскрывается их содержание, определяются приоритеты критики того времени. Обращается внимание на конфликт между социологической и эстетической критикой, обосновывается важность последней для литературного процесса. Сделан

**Образец цитирования:**
Карп А. А. Каштоўнасная парадыгма літаратурнай крытыкі часопіса «Полымя» 1920-х гг. // Весн. БДУ. Сер. 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. 2016. № 2. С. 13–17.

**For citation:**
Karp A. A. Axiological paradigm of magazine «Polymia's» critique during the 1920s. *Vesnik BDU. Ser. 4, Filalogija. Zhurnalistyka. Pedagogika.* 2016. No. 2. P. 13–17 (in Belarus.).

**Автор:**
***Елена Александровна Карп*** – аспирантка отдела теории и истории литературы Института литературоведения им. Янки Купалы. Научный руководитель – доктор филологических наук, профессор М. А. Тычина.

**Author:**
***Alena Karp***, postgraduate student at the department of the theory and history of literature, Yanka Kupala Institute of literature studies.
*alena_karp@yahoo.com*

вывод о том, что плюрализм, который допускала редакция журнала «Полымя», имел существенное значение как для издания, так и для литературной мысли этого периода в целом.

***Ключевые слова:*** 1920-е гг.; литературный процесс; литературная критика; «Полымя»; ценностная парадигма; нашенивская традиция; В. Чаржинский; Н. Байков; И. Замотин.

# AXIOLOGICAL PARADIGM OF MAGAZINE «POLYMIA'S» CRITIQUE DURING THE 1920s

***A. A. KARP*** [a]

[a]*The Center for Belarusian culture, language and literature research of the National Academy of Sciences of Belarus, Surganov street, 1, building 2, 220072, Minsk, Republic of Belarus*

This article is dedicated to the axiological paradigm of «Polymia's» critique during the first period of its existence – 1922–1928 years. Axiological aspect was chosen because it rather determines other aspects with relation to which is possible to analyse the critique. It is explored which directions the critique was followed. The article demonstrates that different conceptions coexisted, develops its substance, determines priorities of the critique this period. Noted that the socialist and the aesthetic critique coexisted in a state of conflict, proved importance of the aesthetic critique. The article finds that resolved of editorial staff pluralism had an important role for the magazine and for critique of this period as a whole.

***Key words:*** 1920s; literary process; critique; literary periodicals; «Polymia»; axiological paradigm; aesthetic discourse; ideological discourse; tradition of «Nasha Niva»; U. Charzhynski; M. Baikou; I. Zamocin.

Літаратурная крытыка, прадстаўленая ў часопісе «Полымя» ў 1922–1928 гг., не з'яўляецца маналітнай. Спробы вызначыць магістральную лінію развіцця літаратуры прадпрымаліся, пэўныя догматы, у межах якіх дзейнічала крытыка, існавалі, аднак гэта галіна літаратуразнаўства характарызавалася размаітасцю падыходаў, плюралізмам. З 1928 г. умацоўваюцца вульгарна-сацыялагічныя метады літаратурнай крытыкі, зніжаецца ўзровень крытычных тэкстаў, па́дае давер да іх. Гэты год фактычна завяршае адносна вольныя 1920-я гг. і распачынае крызісны перыяд у гісторыі беларускай літаратурнай крытыкі.

У межах гэтай працы разгледзім крытычныя артыкулы, апублікаваныя ў часопісе «Полымя» ў пачатковы перыяд яго існавання – з 1922 па 1928 г., звернем увагу на іх каштоўнасную парадыгму. Вывучэнне крытыкі, прадстаўленай у асобным выданні, падаецца мэтазгодным, бо яна адлюстроўвае яго адметнасць, спецыфіку і пры гэтым дае ўяўленне пра агульную карціну літаратурнага працэсу, у нашым выпадку – тэндэнцыі, якія мелі месца ў беларускай літаратурнай крытыцы 1920-х гг. Аксіялагічны падыход быў абраны таму, што ён у многім прадвызначае іншыя аспекты, з пункту гледжання якіх можна аналізаваць літаратурную крытыку: метадалогію, стылістыку, камунікатыўныя стратэгіі.

Аксіялагічная сістэма «палымянскай» крытыкі вызначалася пераважна праграмнымі заявамі, сфармуляванымі ў рэдакцыйным артыкуле «Нашы заданні». Большая частка іх закранала пытанні палітычнага характару, аднак былі акрэслены і магістральныя шляхі развіцця літаратуры: «Наша часопісь мае мэтай даць шырокую дарогу для выяўлення к жыццю тым беларускім пісьменнікам і паэтам, якія кінулі старыя матывы, матывы нудлівага сентыменталізму і самавітага кулацкага народніцтва, якія не знаходзяць натхнення ў ідэях незалежніцтва ды ў нейкай "вялікасці беларускай старадаўшчыны", а каторым навявае мелодыі муза вызвалення працоўных грамадаў, муза калектыўнае творчасці іх»[1] [1, с. 5]. Прыярытэты вялікай часткі крытычных тэкстаў, якія друкаваліся ў часопісе «Полымя», дыктаваліся менавіта гэтай устаноўкай. Пралетарскі, рэвалюцыйны характар літаратуры пастуліраваўся як адна з найвялікшых яе вартасцей, частка паспяховай аўтарскай стратэгіі. Як безумоўна станоўчую рысу крытыка вызначыла сучасныя тэмы ў літаратуры. Новая эпоха патрабавала свайго ўвасаблення і ўслаўлення ў творчасці, і крытыка скіроўвала аўтараў адказваць на запыт часу.

Абазначаная ў праграмным артыкуле апазіцыя паміж старымі і новымі матывамі раскрывалася ў многіх крытычных працах як супрацьпастаўленне літаратуры нашаніўскай нацыянальна арыентаванай і прасякнутай рэвалюцыйным пафасам пралетарскай інтэрнацыянальнай літаратуры. Агульным месцам у крытычнай практыцы 1920-х гг. сталі пасажы пра росквіт, якасны рост, звязаны з перабудовай жыцця, усталяваннем савецкай улады. Адначасова нівеліраваліся вартасці і заслугі нашаніўскай літаратуры, яна станавілася антыподам для маладой рэвалюцыйнай творчасці, якая падавалася крытыкай

[1] Цытаты прыводзяцца з захаваннем лексічных і граматычных асаблівасцей арыгінала.

як передавая і прагрэсіўная. Нашаніўская практыка з яе асветніцкімі, нацыятворчымі, эстэтычнымі функцыямі на старонках «Полымя» 1920-х гг. вызначалася найчасцей праз такія ідэалагемы, як народніцтва, буржуазнасць, нацыяналізм. Творчы набытак папярэднікаў свядома недаацэньваўся, аналізаваўся найперш з пункту гледжання зместу, ідэйнай напоўненасці, якія разглядаліся не ў кантэксце свайго часу, а з пазіцый сучаснасці. Выбудоўваючы апазіцыю паміж нашаніўскай і рэвалюцыйнай савецкай літаратурай, крытыка, такім чынам, у большай ступені служыла прапагандзе, чым аб'ектыўным навуковым інтарэсам.

Было звычайнай практыкай падаваць творчы шлях пэўнага пісьменніка праз змену яго светапогляду, як гісторыю пераходу ад песімізму, зняверанасці, трагічнага светаадчування да жыццесцвярджальнага пафасу, што абазначаўся эпітэтам «здаровы» і ўспрымаўся як норма. Ацэнка таго ці іншага пісьменніка, яго месца ў літаратуры ў многім вызначалася паводле таго, наколькі паспяхова і поўна быў рэалізаваны гэты пераход. Стылістычна такія пасажы часта адрозніваліся павярхоўнасцю, узнёслай рыторыкай, адсутнасцю за агульнымі фразамі канкрэтнага зместу.

Даволі часта, выбудоўваючы апазіцыю «дарэвалюцыйная – рэвалюцыйная літаратура», крытыкі ігнаравалі аб'ектыўныя прычыны іх прынцыповай розніцы, акрамя таго, не заўсёды дэманстравалі высокі літаратуразнаўчы ўзровень. Так, З. Жылуновіч у аглядзе «Беларускі Парнас у новай вопратцы» трактаваў цытаты з твораў нашаніўцаў, кіруючыся сваёй гіпотэзай, але не рэальным сэнсам, які неабходна было ў іх расчытваць. Нават пейзажная, інтымная лірыка ацэньвалася з пункту гледжання адпаведнасці задачам рэвалюцыі.

Крытыка, прадстаўленая ў часопісе «Полымя», характарызавалася даволі адчувальнай дырэктыўнасцю. У той парадыгме, дзе найвышэйшым дасягненнем лічылася рэалізацыя прынцыпу «літаратура, сацыялістычная па змесце, нацыянальная па форме», аўтар быў пазбаўлены права на выяўленне нібыта вузкага патрыятызму. Характар гэтага пачуцця, яго адпаведнасць норме ўдакладняліся крытыкамі: «...паэта любіць сваю радзіму як калыску рэвалюцыі. <...> Любіць не пачуццём кутнікаабываталя, не пачуццём краявіка-шавіністага, а душою рэвалюцыянера-працаўніка, бунтаўшчыкапатрыёта» [2, с. 133].

Быў вызначаны вядучы мастацкі метад – рэалізм – як найбольш адпаведны савецкай пралетарскай літаратуры, што вытлумачальна: рэалістычныя творы ўспрымаліся як простыя, ясныя. Гэта, з аднаго боку, забяспечвала іх даступнасць для шырокага кола чытачоў, з іншага – спрашчала працу цэнзарам. Нерэалістычныя метады пераважна сустракалі непрыманне, негатыўнае, нават пагардлівае стаўленне. Напрыклад, рамантычныя героі Ф. Аляхновіча характарызаваліся Змітраком Бядулем як «напаўпаэтычныя, напаўвар'яты. Словам, вырадкі» [3, с. 62]. І наадварот, рэпутацыя аўтара ўмацоўвалася праз яго прыналежнасць да пануючага напрамку. Так, У. Чаржынскі (псеўданімы – Уладзіслаў Дзяржынскі, Улідзе), усведамляючы неадназначнае стаўленне крытыкаў да паэмы Якуба Коласа «Новая зямля», ацэньвае твор станоўча і пры характарыстыцы аўтара карыстаецца прыёмам нагнятання: «...гэта рэалісты з рэалістых, усёй сваёй творчасцю ўрос у рэальную рэчаіснасць» [4, с. 159].

Рэгламентаваўся крытыкамі «Полымя» і станоўчы літаратурны герой – «чысты высакапробны пралетар» [5, с. 180]. Разам з тым гэты вобраз мусіў не быць хадульным, стэрэатыпным і ідэалізаваным. Як вынікае з крытычных тэкстаў, аўтарам было няпроста задаволіць гэтыя супярэчлівыя патрабаванні. Крытыкай дыктаваліся таксама прыярытэтныя тэмы: каштоўнасць прыватных, асабістых пачуццяў адмаўлялася на карысць выяўлення рэвалюцыі, яе вынікаў. Нормай лічыліся аптымізм, бадзёрасць, заклік да класавай барацьбы, стваральнай працы, змагання з рэлігіяй; адхіленнем ад нормы, якое асуджалася, – індывідуалізм, песімізм, скепсіс.

Каштоўнасная парадыгма крытыкаў, якія друкавалі свае артыкулы ў часопісе «Полымя», сцвярджалася таксама ў дыскусіі з калегамі, якія працавалі па-за межамі БССР. Так, Улідзе аспрэчваў А. Луцкевіча. Калі апошняму еўрапеізацыя айчыннай літаратуры бачылася станоўчай з'явай, сведчаннем росту і развіцця, то Улідзе, наадварот, сцвярджаў, што перавага беларускай літаратуры палягае ў тым, што еўрапейскія ўплывы ў ёй маргіналізаваны і выяўляюцца ў найменшай ступені. Далейшая крытычная практыка У. Чаржынскага не супадала з выказанай пазіцыяй: наадварот, ён зарэкамендаваў сябе як крытык, лаяльны да разнастайных мастацкіх практык, схільны разглядаць літаратуру ў эстэтычных катэгорыях. Такая непаслядоўнасць тлумачыцца, з аднаго боку, наяўнасцю ў тагачасным «Полымі» рэгламентацыі зместу публікаваных матэрыялаў, а з іншага – магчымасцю адносна свабоднага выказвання.

Праграмнае выступленне «Нашы заданні», хоць і заяўляла палітычныя погляды рэдакцыі адназначна, цвёрда і прынцыпова, усё ж пакідала магчымасць іншадумства: «…журнал непартыйны, і мы дапускаем <…> свабоду думак, але ў пэўных межах» [1, с. 4]. Для меркаванняў ідэалагічнага характару гэтыя межы былі даволі вузкімі, што і падкрэслівалася, але ў пытаннях эстэтычных і метадалагічных прыхільнасцей крытыкаў рэдакцыйная палітыка дапускала адносную свабоду.

Пры тым, што большасцю крытыкаў так ці іначай сцвярджалася першаснасць ідэйнага зместу, у «Полымі» 1920-х гг. мела месца і эстэтычная крытыка. Гэта дазваляе характарызаваць перыяд 1922–1928 гг. як дастаткова спрыяльны для літаратурнай думкі. Паняцце «эстэтыка» яшчэ не кляймілася як буржуазнае. Магчымымі былі падрабязныя, з веданнем справы, разборы фармальна-мастацкага боку твораў. Сярод аўтараў, якія займаліся вывучэннем паэтыкі, асабліва варта адзначыць У. Чаржынскага. У яго працах рэалізоўваўся алгарытм, прапанаваны яшчэ В. Бялінскім: заглыбіцца ў мастацкі свет аўтара, спасцігнуць яго ва ўсёй цэласнасці і адметнасці, пры гэтым кіруючыся законамі менавіта гэтага прыдуманага свету, а не ўласнымі чаканнямі [6, с. 83]. Вернасць пралетарскай ідэалогіі не для ўсіх крытыкаў апрыёры вызначала якасць мастацкага твора. У поле ўвагі даследчыкаў траплялі пісьменнікі з самымі living рознымі аўтарскімі стратэгіямі, некаторыя нават уводзіліся ў канон, напрыклад, М. Багдановіч, што ў 1930-я гг. ужо было немагчымым.

Побач са стандартнымі ўстаноўкамі на інтэрнацыянальнасць, якая мусіла спрыяць пашырэнню беларускай літаратуры ў краінах СССР, існавалі і іншыя стратэгіі. Практычна забытымі катэгорыямі «нацыянальнае» і «агульначалавечае» аперыраваў К. Гарабурда, працягваючы тым самым нашаніўскую традыцыю і выводзячы беларускую літаратуру ў кантэкст сусветнай, а не толькі савецкай.

Два погляды на літаратуру, класавы і эстэтычны, канфліктавалі паміж сабой, сведчаннем чаму з’яўляюцца закіды М. Байкова ў бок У. Чаржынскага адносна няправільнай, непатрабавальнай ацэнкі, якую ён даваў літаратуры, нястрогага вытрымлівання сацыялагічнага метаду. Каштоўнасныя ўстаноўкі М. Байкова яскрава выяўляюцца ў яго пярэчанні апаненту (апошні акцэнтаваў увагу на пэўных недахопах зборніка Цішкі Гартнага «Урачыстасць»): «Гэта не шурпатасць, а цвёрдасць і не “неахайнасць”, як кажа крытык, а паэзія рэвалюцыянера, якому няма калі думаць аб літаратурных каўнерчыках ды брыжыках» [7, с. 170]. Прынцыповая нязгода вынікала з кардынальна адрознага разумення прыроды творчасці: калі У. Чаржынскім літаратура разглядалася як мастацтва, то М. Байкоў збядняў яе сутнасць, звужаў да адзінай функцыі і ўспрымаў як «сродак камуністычнага выхавання» [7, с. 173].

Канфлікт паміж эстэтычным і ідэалагічным дыскурсамі быў выразна засведчаны і ў рэцэнзіі З. Жылуновіча (за подпісам Дорндорф) на «Гісторыю беларускае літаратуры» М. Гарэцкага. Характэрнай, істотнай рысай яе з’яўляецца спроба аспрэчваць тэзісы М. Гарэцкага, пераклаўшы іх «на сацыяльную мову» [8, с. 226]. Такім чынам, відавочна, што адэкватная камунікацыя паміж крытыкам і аўтарам немагчыма з прычыны рознасці іх моў, прытым мова «сацыяльная» па змоўчванні лічыцца першаснай і ў такой якасці навязваецца чытачу. Пры перакадзіроўцы «агульналюдскі элемент» пераўтвараўся ў «някласавае мастацтва» [8, с. 226] і з вартасці, дасягнення пераходзіў у разрад заган. Падобную спробу перакладу прадпрымаў З. Жылуновіч і ў дачыненні да А. Бабарэкі. У абодвух выпадках вынік нятоесны арыгіналу, кардынальна адрозны ад яго сваімі канатацыямі.

Доказам таго, што свабода думкі ў 1920-я гг. у часопісе «Полымя» яшчэ дапускалася, з’яўляецца артыкул І. Замоціна «Пуціны беларускай літаратуры». У гэтай працы, акрамя высокага прафесіяналізму, даследчык дэманструе сваю прынцыповую пазіцыю па нацыянальным пытанні, якая працягвала традыцыі «Нашай нівы»: «У тых умовах, у якіх пачынае жыць новая Беларусь і яе пачынаючая адраджацца культура, беларуская літаратура павінна мастацка рэалізаваць нацыянальнае беларускае самавызначэнне, яна павінна быць фактарам культурнага адраджэння Беларусі, у мастацкіх вобразах адбіць асноўныя моманты яе жыцця, узбагаціць літаратурную мову і разам з тым – і гэта найбольш важная задача – яна павінна правесці ў сузнанне шырокіх народных мас ідэалы новай сацыяльнасці...» [9, с. 176]. Апошняя задача ў духу свайго часу абазначана як дамінантная, тым не менш, на думку даследчыка, яна мусіць вырашацца супольна са спецыфічна беларускімі, нацыянальнымі задачамі, якія заяўлены тут першымі і якім І. Замоцін надае сапраўды вялікую ўвагу. (Цікава, што ў тым жа 1924 г. сваё бачанне будучыні беларускай літаратуры выказаў М. Байкоў у артыкуле «Пуці змычкі», дзе разглядаў яе як частку агульнай пралетарскай культуры. Рознасць канцэпцый двух аўтараў выяўляецца нават у назвах: у абедзвюх – семантыка шляху, але І. Замоцін зрушвае фокус на беларускую літаратуру як асноўны аб’ект даследавання і ўжывае паэтычнае, узнёслае слова «пуціны», тым часам як М. Байкоў карыстаецца саветызмам «змычка», і яна ж абазначаецца як жаданая мэта.)

Нашаніўскую традыцыю легітымізаваў на старонках «Полымя» і У. Чаржынскі. У час, калі абвастрыліся праблемы крытыкі, абазначылася тэндэнцыя да вульгарызацыі, даследчык заклікаў калег пераймаць досвед папярэднікаў, якія бачыўся яму плённым дзякуючы кампетэнтнасці найлепшых крытыкаў нашаніўскага перыяду (асабліва вылучаў У. Чаржынскі М. Багдановіча і А. Луцкевіча), стылю, блізкаму да мастацкай літаратуры, а таксама ўдалай камунікатыўнай стратэгіі, здольнай уздзейнічаць на пачуцці і думкі чытача.

Такім чынам, у першыя гады існавання часопіса «Полымя» на яго старонках адбываўся працэс вызначэння каштоўнаснай парадыгмы выдання, фармулюючы якую аўтары ў большай ступені абапіраліся

не на досвед папярэднікаў, а на савецкую літаратурную крытыку, тэорыю Г. Пляханава, які першаснай задачай крытыкі лічыў пераклад мастацтва на мову сацыялогіі. Крытыка ў часопісе «Полымя» была адчувальна падпарадкавана ідэалогіі свайго часу. Ідэалагічнымі меркаваннямі абумоўліваліся яе ўстаноўкі адносна вартасці твора. Быў узяты курс на інтэрнацыянальнасць, літаратуру, сацыялістычную па змесце, нацыянальную па форме. Трэба сказаць, што гэта замінала аб'ектыўнай ацэнцы як нашаніўскай літаратуры, так і пэўных твораў 1920-х гг. У асноўнай сваёй масе крытыка ў часопісе «Полымя» не разглядала эстэтычную вартасць твора як самадастатковую. Разам з тым рэдакцыя заяўляла пра магчымасць альтэрнатыўных меркаванняў і сапраўды дазваляла друкаваць матэрыялы крытыкаў, якія ўяўлялі літаратуру як мастацтва, аналізавалі і ацэньвалі менавіта эстэтычную вартасць. Мелі права голасу аўтары, якія актуалізавалі нашаніўскую традыцыю. Розныя падыходы – нацыянальны і інтэрнацыянальны, класавы і эстэтычны – суіснавалі ў стане канфлікту. Аднак тое, што апалагеты розных поглядаў маглі выказвацца праз часопіс, узбагачала літаратурную думку, забяспечвала наяўнасць у выданні прац высокага літаратуразнаўчага ўзроўню.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС (*REFERENCES*)


1. Нашы заданні // Полымя. 1922. № 1. С. 3–6 [Nashy zadanni. *Polymja*. 1922. No. 1. P. 3–6 (in Belarus.)].
2. *Жылуновіч З.* У надзеях над прасторамі. Жыццё і творчасць Алеся Гурло // Полымя. 1924. № 3. С. 117–135 [Zhylunovich Z. U nadzejah nad prastorami. Zhyccjo i tvorchasc' Alesja Gurlo. *Polymja*. 1924. No. 3. P. 117–135 (in Belarus.)].
3. *Бядуля З.* Тэатр і выхаванне мас // Полымя. 1922. № 1. С. 57–64 [Bjadulja Z. Tjeatr i vyhavanne mas. *Polymja*. 1922. No. 1. P. 57–64 (in Belarus.)].
4. *Дзяржынскі У.* Беларуская літаратурная сучаснасць (1920–1925 гг.) // Полымя. 1925. № 1. С. 136–167 [Dzjarzhynski U. Belaruskaja litaraturnaja suchasnasc' (1920–1925 gg.). *Polymja*. 1925. No. 1. P. 136–167 (in Belarus.)].
5. *Байкоў М. Я.* Нёманскі. На зломе // Полымя. 1926. № 1. С. 180–181 [Bajkow M. J. Njomanski. Na zlome. *Polymja*. 1926. No. 1. P. 180–181 (in Belarus.)].
6. *Белинский В. Г.* Избр. эстет. работы : в 2 т. М., 1986. Т. 2.
7. *Байкоў М.* Наша літаратура за 1925 г. // Полымя. 1926. № 1. С. 167–173 [Bajkow M. Nasha litaratura za 1925 g. *Polymja*. 1926. No. 1. P. 167–173 (in Belarus.)].
8. *Дорндорф*. Максім Гарэцкі. Гісторыя беларускае літаратуры // Полымя. 1926. № 8. С. 223–229 [Dorndorf. Maksim Garjecki. Gistoryja belaruskae litaratury. *Polymja*. 1926. No. 8. P. 223–229 (in Belarus.)].
9. *Замоцін І.* Пуціны беларускай літаратуры // Полымя. 1924. № 1. С. 174–186 [Zamocin I. Puciny belaruskaj litaratury. *Polymja*. 1924. No. 1. P. 174–186 (in Belarus.)].


*Артыкул паступіў у рэдкалегію 11.05.2016.*
*Received by editorial board 11.05.2016.*